# ГЛАВА 3
# ТЫПЫ ЭЛІПТЫЧНЫХ КАНСТРУКЦЫЙ З СЕМАНТЫЧНЫМ КАМПЕНСАТОРНЫМ КАМПАНЕНТАМ

Сістэматызацыя канструкцый з эліпсісам дзеяслова будавалася намі ў адпаведнасці з параметрамі тыпалогіі – тыпам прэдыката і паказчыкам семантыкі. Фармалізацыя сінтаксічнага аб’екта дазволіла сфарміраваць відавыя класы семантычных тыпаў, а таксама найбольш поўна выявіць ступень частотнасціі прадуктыўнасці мадэлей канструкцый (было прааналізавана 7406 адзінак фактычнага матэрыялу). Пры фармалізацыі аб’екта сінтаксісу выкарыстоўвалася тэрміналогія М. У. Усеваладавай (дадатак А).

## 3.1 Дынамічна-лакатыўны

Самую шматлікую групу складаюць эліптычныя сказы дынамічна-лакатыўнага тыпу, якія ўказваюць на семантыку руху. Падобныя канструкцыі павінны ўключаць як мінімум тры пазіцыі – прэдыкат (эліпсаваны), суб’ект і лакатыў,у якіх атрымліваюць сваё выражэнне кампаненты семантычнай структуры. Кампанент з лакатыўным значэннем выконвае ролю паказчыка семантыкі і з’яўляецца абавязковай умовай функцыянавання эліптычных канструкцый: эліпсіс дзеяслова павінен кампенсавацца іншымі моўнымі сродкамі, якія канкрэтызуюць прыналежнасць эліпсаванага дзеяслова да пэўнай лексіка-семантычнай групы.

Семантыка руху рэалізуецца ў пэўнай колькасці мадэлей эліптычных сказаў, дзе тып прэдыката абумоўлівае якасны склад кампанентаў эліптычнай канструкцыі, і тыповы характар набываюць семантычныя кампаненты ў структуры сказа ў строгай адпаведнасці з пэўным тыпам прэдыката.

**Мадэль *агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш*.** Паказчыкам семантыкі мадэлі *агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш* выступае *дырэктыў-фініш,* што абумоўлена структурна-семантычнымі асаблівасцямі лакатываў. Дырэктыў-фініш часцей выражаецца прыслоўем і набывае функцыю семантычнай дамінанты: *– Куды ж ты, дачушка? Людзі на парог, а ты за парог* (А. Кудравец); *І дарослыя, і дзеці – // Ўсе сюды* (З. Бядуля); *Ты, Ігар, куды?* (А. Карпюк). Тыповым сродкам выражэння дырэктыў-фініша выступаюць розныя формы іменных часцін мовы – назоўнік у форме роднага склону: *Павуцінка залатая – да вясковага двара. Верасовая сцяжынка. Па баках – беразнякі* (Г. Бураўкін); *– Я – да нашых куркулёў! Ну не!* (А. Дзялендзік); займеннік у форме роднага склону: *Шэф, да вас жанчына* (А. Дудараў); назоўнік у форме вінавальнага склону: *Інжынер – купец з вы-*

РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ

*шэйшай адукацыяй – у агарод з бульдозерам* (М. Матукоўскі); *– А можа, ён на Петраград, цягнік* (П. Глебка); *– А я – у рэчку! Люблю ў віры паплаваць* (А. Бялевіч).

Агенс у такіх сказах выражаецца пераважна асабовым займеннікам: *– Я – на поўнач* (А. Карпюк); *– Ты можаш з намі ехаць. Я якраз у Водрынку* (А. Макаёнак) або назоўнікам: *Зводны атрад факультэтаў – у адзін з самых прыгожых куткоў – Браслаўскі раён* («Настаўнік»); *Сава – на самую вяршыню, // Найярчэйшую з нябёсаў зорку* (Максім Танк) або на суб'ект перамяшчэння ўказвае зваротак: *– Куды ты, Чаротны?* (А. Кулакоўскі).

Эліптычныя канструкцыі з указаннем на канечны пункт руху могуць быць аднасастаўнымі паводле структуры. Дырэктыў-фініш у такіх сказах дастаткова інфарматыўны і рэалізуе семантыку руху бессуб'ектным спосабам. Закон семантычнага ўзгаднення прадвызначае кола лексем, што могуць занаўняць сінтаксічную пазіцыю эліпсаванага выказніка. Тады персанальнасць аднасастаўных эліптычных канструкцый выражаецца імпліцытна, што абумоўлена спецыфікай іх структурнай арганізацыі: *– Дамоў, на завод? – з робленай паслужлівасцю і нахабствам спытаў шафёр* (І. Канановіч); *Угору, у прадонне вышыні* (Г. Бондар).

**Мадэль *агенс – прэдыкат – транзітыў*.** Мадэль эліптычнага сказа з такімі кампанентамі, як *агенс – прэдыкат – транзітыў*, рэалізуецца пры ўмове, калі эліптычныя сказы з семантыкай руху ўключаюць у свой склад лакатывы, якія ўказваюць кірунак руху. Пазіцыя апушчанага дзеяслова прадстаўлена лексіка-семантычнай групай дзеясловаў са значэннем *ісці, рухацца, перамяшчацца* ў адпаведнай форме. Транзітыў часцей выражаецца прыслоўем *насустрач*: *Насустрач нейкі пан* (М. Сяднёў); *Сонца насустрач і сіні прастор. // Неба і хмары ў вясёлкавай браме* (С. Грахоўскі); *Выйшлі яны пагуляць. А насустрач жанчына з каляскаю* (Г. Багданава); *А перад ім – яснее неба, // А перад ім – машын гудкі. // Насустрач – поле, поле з хлебам. // Насустрач – дзеці, як званкі* (П. Броўка). Назіраюцца выпадкі, калі транзітыў выражаецца рознымі формамі назоўнікаў*: А ўслед за ветрам – вясёлы і часты галоп* (У. Паўлаў); *Праз завею – сані, сані…* (С. Законнікаў).

Транзітыў у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова можа ўказваць на прасторавы арыенцір, межы якога пераадольваюцца ў працэсе руху, і выражаецца назоўнікам у форме роднага або вінавальнага склонаў: *Ты – паўз лес і ў вёску* (Б. Сачанка).

**Мадэль *агенс (імпл.) – прэдыкат – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў*.** У канструкцыях з эліпсісам дзеяслова, калі рэалізуецца мадэль *агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў*, агенс выражаецца імпліцытна, і канструкцыя набывае аднасастаўную будову: *Куды ты ноччу?* (С. Баранавых); *Куды ты так рана?* (А. Жук). Такія мадэлі рэалізуюцца ў значнай колькасці структурных схем, аднак спосабы выражэння тэмпаратыва не вызначаюцца разнастайнасцю. Ён выконвае ролю паказчыка семантыкі толькі ў спалучэнні з прасторавымі сірканстантамі: *Ігналік мой!... Ігналік… Зараз жа дамоў, да яго…* (М. Гарэцкі);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Я назаўсёды сюды* (А. Макаёнак). Зрэдку тэмпаратывы выражаюцца рознымі формамі назоўнікаў: *Прыбегла на пошту. Цёмна ў вачах. // У Мінск напісала некалькі слоў. // Пайшла тэлеграма па правадах. // А Лена той хвіляю – зноўку дамоў* (П. Броўка). Адметнасцю падобных сказаў з'яўляецца тое, што тэмпаратыў нясе асноўную нагрузку ў рэалізацыі семантыкі сінтаксічнай адзінкі. Паказчыкам семантыкі ў дадзеным кантэксце выступае кампанент *надоўга*, які ўказвае на семантыку руху. Указаная мадэль можа рэалізавацца ў разнастайных структурна-граматычных схемах.

Назіраюцца выпадкі, калі тэмпаратыў адмяжоўвае розныя канструкцыі – эліптычныя сказы з семантыкай руху і з семантыкай статальнай лакалізацыі. Эліптычны сказ тыпу *Мы – на Волзе* можа мець некалькі семантычных напаўненняў. Гэтаму спрыяе нетыповая форма выражэння дырэктыва-фініша – форма меснага склону замест вінавальнага. У падобных сказах тэмпаратыў канкрэтызуе семантыку апушчанага дзеяслова: *Праз некалькі дзён мы – на Волзе* (А. Макаёнак).

**Мадэль *агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт.*** Функцыю паказчыка семантыкі мадэлі *агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт* выконвае *дырэктыў-старт*, які ўказвае на зыходны пункт і спалучаецца толькі з дзеясловамі лексіка-семантычнай групы руху. Выражаецца ён як прыслоўем: *Адкуль жа вы, дзеткі? З вашай Альхоўкі* (А. Якімовіч); *А кулі, кулі – адусюль. // Няма ратунку ім ад куль* (П. Броўка), так і назоўнікам у форме роднага склону з прыназоўнікамі: *Ты – з глыбіні Віёлавых садоў* (Л. Дранько-Майсюк); *Я – з глыбокіх нетраў, // Вечная, жывая* (А. Русак).

**Мадэль *агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт – дырэктыў-фініш.*** Калі лакатывы ўказваюць на напрамак руху ад пачатковага да канечнага пункта, то семантыка руху рэалізуецца ў мадэлі *агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт – дырэктыў-фініш,* кампанентах, якія выражаюцца пераважна назоўнікамі ў форме вінавальнага або роднага склонаў з прыназоўнікамі: *Іскры з кузні – за парог, // На лядочак тонкі* (А. Бялевіч); *Што ж гэта мы, бацька, з-за стала зноў за стол* (А. Жук); *Выходзіць, ён з таго моста ў палонку?* (Г. Марчук); *З натоўпу – у натоўп. // Бездапаможна* (Т. Бондар) або прыслоўямі: *Адсюль – сюды… Адтуль – туды…* (М. Зарэцкі).

**Мадэль *агенс – прэдыкат – медыятыў-1.*** Калі ў якасці паказчыка семантыкі руху выступае *медыятыў-1*, то рэалізуецца *мадэль агенс – прэдыкат – медыятыў-1*: *У «Заслаўль» толькі на 227-м* (Г. Багданава); *Хмарай пыл – за салдатамі* (А. Вялюгін); *А шнур (жуtoday) парваны – нізам, нізам, нізам* (А. Пысін)*; Ты – пехатою? Дзе ж твой конь?* (М. Гарэцкі). Выразны характар прыведзеныя сказы набываюць дзякуючы таму, што медыятывы маюць абмежаванае кола лексем, з якімі могуць спалучацца: гэта пераважна дзеясловы тыпу *ісці, бегчы, рухацца* і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мадэлі** ***агенс – прэдыкат – дыменсіў-1*** і ***агенс – прэдыкат – дыменсіў-3.*** У якасці паказчыка семантыкі часам выступае *дыменсіў-1*. Мадэль эліптычнага сказа ўключае пры такой умове кампаненты *агенс – прэдыкат – дыменсіў-1*: *Мы па свята зрунелых ніў, // Мы па рэк малады разліў* (М. Шабовіч); *А вам далёка?* (В. Быкаў). Калі ж паказчыкам семантыкі выступае *дыменсіў-3,* то і мадэль эліптычнага сказа будзе ўключаць *агенс – прэдыкат – дыменсіў-3*: *Я – мігам. На адной назе* (А. Макаёнак); *– Я – хутка. Ты пасядзі тут* (Г. Багданава); *Хутчэй, хутчэй адсюль* (Г. Багданава). Выражаюцца дыменсівы пераважна назоўнікамі або прыслоўямі і характарызуюць рух не толькі паводле працягласці, але і паводле колькаснай або якаснай прыкметы.

**Мадэль** ***агенс (імпл.) – прэдыкат – транзітыў – медыятыў-1.*** Мадэль з кампанентамі *агенс – прэдыкат – транзітыў – медыятыў-1* рэалізуецца пры ўмове спалучэння медыятыва-1 з транзітывам: *І Алёшка, // Мірон і Зянон – // Па карчах, па кустах // Наўздагон* (А. Пысін); *Абы хутчэй – праз луг...* (Г. Далідовіч); *Травы – клубам – з-пад касы* (А. Бялевіч); *І – раптам дымок над вадой* (П. Прыходзька).

**Мадэль** ***агенс – прэдыкат – фінітыў-1.*** У выпадках, калі паказчыкам семантыкі выступаюць *фінітывы,* указваючы на мэту руху суб'екта ў прасторы, мадэль эліптычных сказаў уключае кампаненты *агенс – прэдыкат – фінітыў-1*: *Снег – каму для радасці, каму для бяды* (А. Бачыла); *– Па якой ты справе?* (В. Іпатава); *– Я – па справе* (Г. Мікуліч); *– Я – па калгасных справах* (С. Баранавых); *– Я тут – па справе* (А. Макаёнак) або *агенс – прэдыкат – фінітыў-4*: *Закончыліся студэнцкія гады. І Міхаіл Адамавіч Баравуля – настаўнічаць* («Крупскі веснік»); *Уся армія – на штурм ракі* (М. Калачынскі); *Абодва – на фронт* (А. Кулакоўскі); *Я лепш – на паляванне. Прырода, прастор…* (А. Дзялендзік); *На споведзь я* (А. Петрашкевіч). Дырэктыў-фініш можа выражацца эксплііцытна: *За баладамі да маладзечанцаў* (ЛіМ); *На Міншчыну па вопыт* («Звязда»); *«За золатам» – у Любачы* («Ленінскі шлях»); *Да суседзяў – па здароўе* («Дзеці і мы»); *Школьны хор – у Смалявічы на агляд* («Край Смалявіцкі»).

**Мадэль** ***агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – медыятыў-1.*** Калі медыятыў рэалізуе семантыку руху ў аднасастаўных эліптычных канструкцыях, то мадэль сказа чатырохкампанентная: *агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – медыятыў-1*. Значэнне руху рэалізуецца з дапамогай спалучэння характарызацыйных сірканстантаў з прасторавымі. Агенс можа выражацца імпліцытна: *Праз цемру ценяў нацянькі – // Да зор, да неба* (М. Шабовіч); *Хлопцы! Хутчэй – на завод!* (А. Дзялендзік). Пашырэнне семантычнай структуры сказа за кошт медыятыва надае ім большую выразнасць і семантычную ёмістасць: *А сама басаню // Па дажджы і калдобах* (Я. Янішчыц); *Мурзатыя, як чарцяняты, // Дзеці на рэчку – трушком* (М. Калачынскі); *Ён хутчэй на двор. Яна – за ім* (Г. Далідовіч); *У залатым чоўне на выспу Патмас* (М. Гарэцкі).

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

**Мадэль** ***агенс (імпл.) – прэдыкат – кандытыў – медыятыў-1.*** Медыятывы могуць выкарыстоўвацца ў якасці паказчыка семантыкі і ў спалучэнні з кандытывамі. Пры такой умове семантыка руху рэалізуецца ў мадэлі *агенс – прэдыкат – кандытыў – медыятыў-1*. Гэта тлумачыцца тым, што суб'ект у большасці падобных сказаў прадстаўлены імпліцытна, а таму колькасць сінтаксічных кампанентаў мінімальная. Такая камбінацыя кампанентаў з'яўляецца рэдкай з'явай: *Туман над полем ярам, ярам* («Крупскі веснік»); *Пад такім агнём немагчыма нават і па-пластунску* (В. Быкаў). Назіраюцца рэдкія выпадкі, калі эксплiцытна выражаецца толькі медыятыў: *Аўтобусам ці поштай. Як легалізаваць патрэбную паслугу?* («Звязда»).

**Мадэль** ***агенс (імпл.) – прэдыкат – фінітыў-4 – тэмпаратыў*** указвае на мэту перамяшчэння ў прасторы: *Хай хто-небудзь спачатку адзін як бы ў разведку. А пасля другі... Каб не абоім адразу* (В. Быкаў). Падобная семантыка ў канструкцыях з эліпсісам дзеяслова назіраецца не часта.

**Мадэль** ***агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт – медыятыў-1.*** Калі медыятывы ўказваюць на розныя ўмовы працякання працэсу, што канкрэтызуе семантыку эліптычнага сказа, то рэалізуецца мадэль *агенс – прэдыкат – транзітыў – медыятыў-1*. Сінтаксічная пазіцыя медыятываў розная, аднак часцей за ўсё яны размяшчаюцца ў сярэдзіне або ў канцы сказа і выражаюцца прыслоўямі або назоўнікамі ў форме творнага склону: *Немцы з лесу ланцугом* (А. Дудараў); З *лесу ў аб'езд прыйдзецца. Але да дванаццаці ўправімся* (Б. Мікуліч); *Услед за сонцам – нацянькі* (З. Бяспалы).

**Мадэль** ***агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – дыстрыбутыў-2.*** Мадэль эліптычнага сказа *агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – дыстрыбутыў-2* рэалізуецца тады, калі дыстрыбутыў-2 указвае на дынамічную працэсуальнасць, якая паўтараецца пастаянна або перыядычна і выражаецца прыслоўем: *Зноў ты да нас, Міхаіл* (М. Матукоўскі); *Зноў я на кухню* (Г. Багданава).

**Мадэлі** ***агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш*** і ***агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў.*** Калі паказчыкам семантыкі руху ў эліптычных сказах выступае дырэктыў-фініш, гэта семантыка рэалізуецца ў мадэлях *агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш*: *Мы з вучнямі шостага класа – у паход на малую радзіму Вольгі Дзёмінай – вёску Забаенне* («Адкрыты ўрок»)*; Ну, пакуль, // А я з парторгам – // У брыгады да касцоў* (П. Броўка); *Як я тады рашылася. Адна з імі трыма (дзецьмі) ды праз усю краіну* (Г. Багданава) і *агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў*: *Дзень кожны я з стадам – сюды, на балота* (З. Бядуля).

**Мадэль** ***агенс – прэдыкат – каўзатыў – дырэктыў-фініш.*** Агенс у канструкцыях, створаных па мадэлях *агенс – прэдыкат – каўзатыў – дырэктыў-фініш* і *агенс – прэдыкат – каўзатыў – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў*, часта выражаецца імпліцытна – з дапамогай формы эксплiцытна выражанага дзеяслова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

папярэдняга сказа: *Не аглядайся. // З радасці – да зор нябёсных* (Р. Баравікова); *Хата была прыбрана. І Таццяна па звычаі – на вуліцу* (У. Шахавец); *Мікола чамусьці – у бок школы* (Г. Марчук). Назіраюцца выпадкі, калі маркіруецца час працякання працэсу. У гэтых выпадках мадэль уключае кампаненты *агенс – прэдыкат – каўзатыў – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў*: *У тую ж хвіліну Сцяпан знячэўку – за парог* (А. Бачыла).

**Мадэль *агенс – каагенс – прэдыкат – дыстрыбутыў-2.*** Мадэль эліптычнага сказа будзе змяшчаць кампаненты: *агенс – каагенс – прэдыкат – дыстрыбутыў-2* тады, калі ў якасці паказчыка семантыкі можа выступаць дыстрыбутыў-2: *Міхась пасля працы, як правіла, з сябрамі. То ў кіно іх бачаць, то на стадыёне* («Настаўнік»).

Градацыйная класіфікацыя мадэлей эліптычных канструкцый з семантыкай руху (намі прааналізавана 3863 адзінкі) на аснове ступені частотнасці, якая прадугледжвае колькасныя характарыстыкі мадэлей, і прадуктыўнасці – здольнасці мадэлей рэалізавацца ў пэўнай колькасці структурных схем (у дужках падаецца колькасць структурных схем, у якіх рэалізуецца тыповая семантыка мадэлі) мае наступны выгляд (рысунак 3.1).

Да адносна высокачастотных[1] (дадатак Б 1) адносяцца мадэлі: агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш (18 %), агенс – прэдыкат – транзітыў (17 %), агенс (імпл.) – прэдыкат – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў (12 %), агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт (8 %), агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт – дырэктыў-фініш (8 %), агенс – прэдыкат – медыятыў-1 (7,4 %), агенс – прэдыкат – дыменсіў-1 (6 %).

Да мадэлей з адносна нізкай ступенню частотнасці адносяцца: агенс – прэдыкат – транзітыў – медыятыў-1 (3,4 %), агенс – прэдыкат – фінітыў-1 (3,2 %), агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – медыятыў-1 (3 %), агенс – прэдыкат – каўзатыў – дырэктыў-фініш (2,6 %), агенс – прэдыкат – фінітыў-4 (2,2 %), агенс – прэдыкат – дыменсіў-3 (1,5 %), агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт – медыятыў-1 (1,4 %), агенс – прэдыкат – медыятыў-3 (1 %), агенс – прэдыкат – кандытыў – медыятыў-1 (1 %), агенс – прэдыкат – фінітыў-4 – тэмпаратыў (1 %), агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – дыстрыбутыў (1 %), агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш (0,8 %), агенс – прэдыкат – каўзатыў – дырэктыў-фініш (0,7 %), агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў (0,6 %), агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш (0,3 %). Ступень частотнасці мадэлі абумоўлена характарам семантычных кампанентаў, што ўваходзяць у яе склад.

[1] Крытэрыем падзелу на высока- і нізкачастотныя (або высока- і нізкапрадуктыўныя) мадэлі выступае паказчык *p*. Сярэдняя частата (або прадуктыўнасць) мадэлі вылічваецца па формуле $p = \frac{100\%}{n}$, дзе *n* – колькасць мадэлей унутры класа з агульнай семантыкай або колькасць структурных схем унутры пэўнай мадэлі.

РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Рисунак 3.1. – Дынамічна-лакатыўны тып: частотнасць мадэлей**

Да высокапрадуктыўных (дадатак А.1) адносяцца мадэлі: агенс – прэдыкат – транзітыў (17), агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў (13), агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт (9), агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт – дырэктыў-фініш (9), агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш (8), агенс – прэдыкат – медыятыў-1 (5), агенс – прэдыкат – фінітыў-1 (4), агенс – прэдыкат – дыменсіў-1 (4), агенс – прэдыкат – транзітыў – медыятыў-1 (4).

Да малапрадуктыўных[1] адносяцца мадэлі: агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – медыятыў-1 (3), агенс – прэдыкат – каўзатыў – дырэктыў-фініш (3), агенс – прэдыкат – фінітыў-4 (2), агенс – прэдыкат – дыменсіў-3 (2); агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт – медыятыў-1 (2), агенс – прэдыкат – фінітыў-4 – тэмпаратыў (1); агенс – прэдыкат – медыятыў-3 (1), агенс – прэдыкат – дырэктыў-

фініш – дыстрыбутыў (1), агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш (1), агенс – прэдыкат – кандытыў – медыятыў-1 (1), агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў (1), агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў (1), агенс – каагенс – прэдыкат – дыстрыбутыў-2 (1) (рысунак 3.2).




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Рысунак 3.2. – Дынамічна-лакатыўны тып: прадуктыўнасць мадэлей**

Ступень прадуктыўнасці мадэлі залежыць ад якаснага складу яе кампанентаў. Здольнасці некаторых кампанентаў дазваляюць ім рэалізавацца ў значнай колькасці часцін мовы і іх форм, што і забяспечвае мадэлям высокую ступень прадуктыўнасці.

У якасці паказчыка семантыкі руху (дадатак Г.1) ужываюцца наступныя кампаненты: дырэктыў-фініш (38 %), транзітыў (20,1 %), дырэктыў-старт (10 %), дырэктыў-старт і дырэктыў-фініш (8,5 %), медыятыў (8 %), дыменсіў-1 (6,5 %), фінітыў-1 (3,4 %), фінітыў-4 (2,5 %), дыменсіў-3 (2 %), медыятыў-3 (0,7 %),

каагенс (0,3 %). Роля паказчыкаў семантыкі абумоўлена законам семантычнага ўзгаднення: большасць кампанентаў з прасторавым значэннем, а таксама фінітыў-1, фінітыў-4, дыменсіў-1, дыменсіў-3, медыятыў-3 і спосаб спалучаюцца толькі з дзеясловамі лексіка-семантычнай групы руху.

Спосабы выражэння кампанентаў, што ўваходзяць у склад мадэлей, самыя розныя. Найбольш часта дырэктыў-старт, дырэктыў-фініш, транзітыў выражаюцца назоўнікамі, значна радзей – прыслоўямі і займеннікамі. Агенс выражаецца рознымі формамі займенніка або назоўніка ці імпліцытна. Фінітыў і медыятыў выражаюцца пераважна назоўнікамі, дыменсіў і спосаб – прыслоўямі.

## 3.2 Экзістэнцыяльна-лакатыўны

Эліптычныя сказы са значэннем статальнай лакалізацыі ўжываюцца даволі часта ў творах мастацкай літаратуры. Гэта тлумачыцца тым, што яны ўжо на ўзроўні сінтаксічных кампанентаў утвараюць тыповую сітуацыю. Дзеяслоў са статальным значэннем апускаецца часцей за іншыя, што выклікана камунікатыўным заданнем эліптычнага сказа – паказаць месца размяшчэння аб’екта або проста ўказаць на яго наяўнасць. Дамінуючым кампанентам у рэалізацыі семантыкі выступае *лакатыў*: *У куце на саломе – цяля з засохлым кончыкам пупавіны* (А. Карпюк); *На стозе – бусел макаўкаю лета* (М. Стральцоў); *У многіх на злінялых прапацелых гімнасцёрках – ордэны* (С. Грахоўскі).

Мадэль эліптычнага сказа з семантыкай статальнай лакалізацыі ўключае наступныя кампаненты: ***экзісцыенс – прэдыкат – лакатыў***.

Пазіцыя лакатыва са статальным значэннем часцей за ўсё знаходзіцца ў абсалютным канцы сказа: *На абеліску – твой апошні ордэн* (С. Законнікаў); *На беразе – белы цвет* (Я. Крупенька); *Зіма… Зіма… У палях – туманы* (П. Трус). Выражаецца экзісцыенс пераважна назоўнікам ці асабовым займеннікам, пры гэтым эліптычныя сказы могуць набываць форму пытальнага сказа: *Гаспадар – у хаце?* (І. Мележ).

Эліптычныя канструкцыі *са значэннем статальнай лакалізацыі ў межах прасторавага арыенціра* ўключаюць эліпсаваны дзеяслоў і два матэрыяльна выражаныя кампаненты. Адметнасць семантыкі такіх сказаў заключаецца ва ўказанні на канкрэтны прасторавы арыенцір, прычым экзісцыенс можа выражацца імпліцытна: *Агеньчык у цемры* («Дзеці і мы»); *Там, за Днепрабугам* («Ленінскі шлях»); *Твае салдаты тут, у акопах* (А. Дудараў); *Станцыя. Я ў цягніку* (М. Сяднёў). Лакатыў у дадзеных канструкцыях можа выражацца самымі рознымі спосабамі – формамі назоўніка: *Пад небам беларускага слова* (ЛіМ); *Святло далёкай зоркі – над вадой* (А. Грачанікаў); *Альпійская ружа – у нава-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ